# МЕДЫЦЫНСКАЯ ТЭМАТЫКА Ў ТВОРЧАСЦІ АЛЕСЯ НАЎРОЦКАГА

**Вашкевіч М. Д.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Навуковы кіраўнік – к. філал. н., дац. *Брусевіч А. А.*

Сярод найважнейшых якасцей, неабходных медыку, можна назваць не толькі высокі ўзровень навуковых ведаў, але і гуманістычны светапогляд. Заўважым, чалавекалюбства з’яўляецца таксама асноўнай кропкай судакранання медыцыны з літаратурай, паколькі гуманізм прызнаны вышэйшай каштоўнасцю любой высокамастацкай творчасці. Разам з тым, можна назваць не так шмат людзей, якія б адначасова рухаліся ў абодвух згаданых кірунках. Сярод іх асабліва вылучаецца постаць беларускага пісьменніка і ўрача Алеся Наўроцкага, у паэтычнай і празаічнай творчасці якога цесна пераплецены неабстрактны гуманізм і яскравыя медыцынскія дэкарацыі, узятыя з уласнага прафесійнага досведу.

А. Наўроцкі нарадзіўся ў 1937 годзе ў вёсцы Давыдаўка Гомельскай вобласці. Яго бацькі былі настаўнікамі і з маленства прывівалі сыну любоў да літаратуры. Скончыўшы сямігодку ў роднай вёсцы, А. Наўроцкі па прыкладу свайго старэйшага брата паступіў у Бабруйскую школу санфельчараў, якую паспяхова скончыў. Далей малады медык некалькі гадоў быў фельчарам у вёсцы Вышкава, потым шэсць гадоў вучыўся ў Мінскім медыцынскім інстытуце і тры гады працаваў урачом у Аравічскай участковай бальніцы. Сярод яго пацыентаў было нямала ветэранаў вайны і проста сталых людзей, якія расказвалі яму мноства займальных гісторый са свайго жыцця. Некаторыя з гэтых аповедаў А. Наўроцкі выкарыстае пазней у сваёй творчасці. Пасля Аравічаў А. Наўроцкі пераехаў у Мінск, дзе шмат гадоў працаваў на станцыі хуткай дапамогі.

Безумоўна, такая цесная сувязь з медыцынай не магла не адлюстравацца ў літаратурнай дзейнасці А. Наўроцкага. Напрыклад, зборнік “Гарачы снег”, выдадзены ў 1968 г. (у гэты час паэт працуе ўрачом хуткай дапамогі), адкрывае верш “Прымаю роды”, у якім параўноўваюцца вобразы і лёсы дзвюх жанчын – юнай парадзіхі, родам з вёскі, але ўдала інтэграванай знаёмым дацэнтам у сталіцу і такой жа маладой, аднак нікому не патрэбнай вясковай жанчынай. Аўтар разважае на тэму адзіноты і таго, як важна цаніць усё, што маеш:

Ёй сніцца ваша доля часам,
як глыб нябеснай сінявы,
яна б не войкнула ні разу,
каб толькі легчы там, дзе вы.

Што ж, рукі мы заспіртавалі,
і нам цяпер сядзець, чакаць.



Репозиторий ГрГМУ

Крычыце, як да вас крычалі

І будуць пасля вас крычаць [1, с. 27].

Але асабліва інтэнсіўна зблізілася з медыцынай творчасць А. Наўроцкага пачала з яго наступнай кнігі паэзіі "Пакаленні і папялішчы", выдадзенай у 1990 г. Мноства вершаў у гэтым зборніку прысвечаны ўспамінам пра медыцынскую практыку паэта. Напрыклад, вершы "Калідор бальнічны", "Блукаю са скрынкай..." і інш. з неверагоднай рэалістычнасцю раскрываюць багаты ўнутраны свет лірычнага героя-медыка, у якім, канешне ж, прачытваецца асоба аўтара і яго асабістая драма. Увогуле, ледзь не ў кожным другім вершы з апублікаваных А. Наўроцкім у позні перыяд творчасці (а гэта 1990–2011 гады) прысутнічае медыцынская тэматыка, якая адлюстроўвае як знешнюю, так і ўнутраную прастору рэальнага і мастацкага свету паэта-лекара.

Нельга абысці ўвагай і паэму "Палячыце нас, доктар!", стылізаваную пад звароты пацыентаў і іх гісторыі – асабістыя, таму вельмі розныя, але нязменна трагічныя і чалавечныя. Таксама вельмі шмат вершаў А. Наўроцкі прысвяціў часу свайго студэнцтва: экзаменам па анатоміі, бяссонным начам над падручнікам і снегу, які падае за вокнамі прапахлых фармалінам аўдыторый.

Але, відаць, самым галоўным творам у спадчыне А. Наўроцкага з'яўляецца раман "Валун", над якім аўтар працаваў усё жыццё, пастаянна перапісваючы і дапаўняючы. "Валун", як і большасць тэкстаў пісьменніка, пранізаны вобразамі, звязанымі з медыцынай і ўрачэбным светапоглядам. Нават галоўны герой рамана Алесь – малады вясковы фельчар, заняты пошукамі сябе на фоне медыцынскай практыкі. Гэты персанаж атрымлівае развіццё і ў рамане "Прыпяць": ён ужо скончыў медінстытут і стаў урачом у вёсцы Агурковічы (прамая алегорыя на Аравічы, дзе працаваў сам пісьменнік), аднак па-ранейшаму адчувае расчараванне ў жыцці і разгубленасць. Згаданыя творы па большай частцы маюць аўтабіяграфічны характар, паколькі гісторыі галоўных герояў утрымліваюць у сабе мноства эпізодаў з жыцця аўтара.

На жаль, творчы геній А. Наўроцкага быў прыгнечаны ў пачатку васьмідзясятых, калі ён публічна выступіў супраць прымянення ў СССР "карнай псіхіятрыі". Пасля гэтага яго пазбавілі працы і паставілі на ўлік у псіхдыспансер. Так вялікі гуманіст А. Наўроцкі, які пратэставаў супраць рэпрэсіўнай псіхіятрыі, сам стаў яе ахвярай і амаль на дваццаць гадоў знік з поля зроку чытачоў. Ён так і не змог вярнуць сабе працу лекара і ўсю астатнюю частку жыцця прысвяціў спробам узнавіць творчую дзейнасць, напісаць як мага больш твораў, пакуль яшчэ ёсць час. Памёр пісьменнік у хоспісе ў красавіку 2012 года, пакінуўшы пасля сябе несправядліва малую колькасць публікацый і мноства чарнавікоў, забароненых савецкай цэнзурай. Аднак гэта быў высакародны шлях мастака-лекара, напоўнены гуманізмам і спагадлівасцю.

Літаратура:

1. Наўроцкі, А. П. Выбраныя творы / А. П. Наўроцкі. – Мн. : Беларуская навука, 2016. – 640 с.



Рэпазіторый ГрГМУ